# АЛІМПІЯДА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ПРАФЕСІЙНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ

*Азарка В.У., кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Васілеўская А.С., кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, г. Мінск*

Анатацыя. У дакладзе раскрываецца роля алімпіяды па беларускай мове ў фарміраванні прафесійных кампетэнцый будучых настаўнікаў, прадстаўлены вопыт арганізацыі і правядзення алімпіяды «Septem artes līberales» на факультэце пачатковай адукацыі БДПУ.

*Ключавыя словы: прадметная алімпіяда, кампетэнтнасны падыход, фарміраванне прафесійных кампетэнцый, пазааўдыторная праца, якасць адукацыі.*

У сучасных эканамічных умовах, калі адукацыйная сістэма пастаянна змяняецца, надзвычай востра стаіць пытанне пра падрыхтоўку спецыялістаў з шырокім кругаглядам, высокай культурай, здольных прымаць нестандартныя рашэнні, гатовых да самаўдасканалення і самаразвіцця. Стандарт трэцяга пакалення па спецыяльнасці 1-01 02 01 «Пачатковая адукацыя» арыентуе на фарміраванне ў будучых настаўнікаў пачатковых класаў цэлага шэрага прафесійных кампетэнцый. Спецыяліст з вышэйшай адукацыяй павінен быць здольным кіраваць вучэбна-пазнавальнай, навукова-даследчай дзейнасцю навучэнцаў, арганізоўваць і праводзіць вучэбныя заняткі розных відаў, арганізоўваць самастойную работу навучэнцаў, фарміраваць базавыя кампаненты культуры асобы, развіваць навыкі самастойнай работы навучэнцаў з вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурай, рознымі крыніцамі інфармацыі і інш. [1, 8–9]. Такім чынам, падчас навучання ва ўніверсітэце будучы настаўнік павінен авалодаць дзейнасцю, скіраванай на развіццё ўласных творчых здольнасцей і пазнавальных інтарэсаў, каб пазней развіваць гэтыя якасці ў сваіх навучэнцаў.

Якаснае фарміраванне асобы педагога немагчыма ажыццявіць толькі ў час заняткаў, ва ўстановах вышэйшай адукацыі павінна быць створана цэласная адукацыйная сістэма, якая ўключае ў сябе як аўдыторную, так і пазааўдыторную дзейнасць студэнтаў.

Адной з эфектыўных форм пазааўдыторнай працы, цесна звязанай з вучэбнай дысцыплінай, з’яўляецца, на нашу думку, прадметная алімпіяда – спаборніцтва, якое патрабуе ад удзельнікаў дэманстрацыі ведаў і навыкаў з пэўнай галіны. Алімпіяда дазваляе студэнтам прадэманстраваць трываласць засвоеных ведаў па дысцыпліне і ўменне прымяняць іх у новых умовах, выкладчыкам – выявіць таленавітых студэнтаў, у якіх развіта моўнае чуццё і якія здольныя нестандартна мысліць, прымаць рашэнне на аснове аналізу моўных фактаў,

На факультэце пачатковай адукацыі БДПУ на працягу 7 гадоў праводзіцца алімпіяда па беларускай мове Septem artes liberales (Сем вольных мастацтваў). Праграма алімпіяды абавязкова ўключае заданні па такіх раздзелах лінгвістыкі, як арфаграфія, фанетыка, лексіка, фразеалогія, марфеміка і словаўтварэнне, граматыка. Аднак форма правядзення алімпіяды нестандартная, паколькі арганізатары лічаць важным не толькі вылучыць пераможцаў, праверыць трываласць ведаў удзельнікаў, але і пашырыць іх кругагляд.

Фармат першай алімпіяды, праведзенай у 2011 г., падказала сістэма навучання ў сярэднявечных еўрапейскіх універсітэтах. Як вядома, перш чым атрымаць адну з трох спецыяльнасцей, якую прапаноўвалі тагачасныя ўніверсітэты, усе будучыя студэнты павінны былі прайсці навучанне на артыстычным факультэце і здаць экзамены па сямі вольных мастацтвах: трывіум – граматыка, рыторыка, дыялектыка, квадрывіум – арыфметыка, геаметрыя, астраномія, музыка. Менавіта таму факультэцкая алімпіяда па беларускай мове атрымала назву Septem artes liberales, а яе ўдзельнікі павінны былі выканаць сем заданняў.

Першапачаткова арганізатары імкнуліся назваць выпрабаванні так жа, як і вольныя мастацтвы, і асацыятыўна звязаць іх. Напрыклад, заданне па ***геаметрыі*** гучала так: *Слова* ***геаметрыя*** *грэчаскага паходжання: geometria – меранне зямлі. У беларускай мове захавалася нямала фразеалагізмаў, у якіх узгадваюцца розныя старажытныя, даметрычныя, адзінкі вымярэння. Многія з гэтых слоў уваходзяць у склад фразеалагізмаў. Задача ўдзельнікаў запісаць, пра якую адзінку вымярэння і пра які фразеалагізм ідзе гаворка: «Гэту адзінку вымярэння мы згадваем, калі гаворым пра чалавека вельмі высокага росту» (вярста, каломенская вярста).* Удзельнікам алімпіяды давялося ўспомніць фраземы са словамі *аршын, вярста, сажань, пуд* і г.д.

Кожны экзамен суправаджаўся дэвізам, цесна звязаным з тэматыкай алімпіяды. У 2011 г. гэта былі лацінскія афарызмы: *ad modum* (па падабенстве) да экзамену па арыфметыцы, *per áspera ad ástra* (праз церніі да зорак) – да экзамену па астраноміі і г. д. Алімпіяда 2012 г. была прысвечана Францыску Скарыне, таму ў час правядзення гульні гучалі словы з прадмоў першадрукара да кніг Бібліі. Так, экзамену па арыфметыцы папярэднічалі такія словы: *«Люболити ест умети аритметику, еже вократце а неомыльне считати учить, четвертый книги Моисеевы часто чти».* А ў заданні ад студэнтаў патрабавалася расставіць прапанаваныя словы ў парадку змяншэння ў іх колькасці гукаў. У 2013 г. тэматыка алімпіяды была падказана раманам Германа Гесэ «Гульня шкляных перлаў», і таму кожнаму экзамену папярэднічала цытата з гэтага твора. Напрыклад, экзамен па рыторыцы пачынаўся словамі: *...наша Гульня шкляных перлаў – гэта гульня з*

*усімі сэнсамі і каштоўнасцямі нашай культуры, майстар гуляе з імі, пацвельваецца, як у эпоху росквіту жывапісу мастак гуляў фарбамі сваёй палітры; а* само выпрабаванне патрабавала ад удзельнікаў умення «гуляць» значэннямі і семантычнымі адценнямі слова: удзельнікам алімпіяды неабходна было злучыць прапанаваныя сем назоўнікаў (*акуляры, варона, вуліца, дзень, кроў, певень, птушка*) і сем прыметнікаў (*белая, блакітная, зялёная, ружовыя, сіняя, чорны, чырвоны*) так, каб атрымаўся фразеалагізм.

З цягам часу карэляцыя паміж алімпіяднымі заданнямі і сямю вольнымі мастацтвамі стала больш абстрактнай. Нязменнымі засталіся назва алімпіяды, колькасць экзаменаў і колькасць заданняў – сем.

Кожная алімпіяда тэматычная: у 2014 г. у цэнтры ўвагі быў час, таму экзамены атрымалі назвы па днях тыдня, у 2015 г. конкурс быў прысвечаны знакамітым асобам Беларусі, юбілей якіх святкаваўся ў гэтым годзе (Кірыла Тураўскі, Мікола Гусоўскі, Францыск Скарына, Васіль Цяпінскі, Сымон Будны, Лаўрэнці Зізаній, Францішак Багушэвіч), у 2016 г. удзельнікі адправіліся ў кругасветнае падарожжа і кожны экзамен здаваўся на адным з кантынентаў, выпрабаванні музычнай алімпіяды 2018 г. мелі тыя ж назвы, што і 7 нот.

Арганізатары алімпіяды імкнуцца захаваць тэматычны прынцып і ў змесце заданняў. Напрыклад, у 2016 г. на экзамене, які быў звязаны з Афрыкай, студэнтам трэба было ўтварыць і запісаць прыметнікі ад назваў краін *Марока, Конга, Сьера-Леонэ, Мазамбік, Егіпет, Свазіленд, Туніс, а* арфаграфічныя памылкі ўдзельнікі выпраўлялі ў тэксце пра Антарктыду. На алімпіядзе, прысвечанай музыцы, для выканання падобнага задання быў прапанаваны тэкст пра віяланчэль.

Абавязковым элементам алімпіяды сталі своеасаблівыя прадмовы да кожнага экзамена, у час якіх удзельнікі і балельшчыкі атрымлівалі шмат пазнавальнай інфрамацыі: пра паходжанне ў розных індаеўрапейскіх мовах назваў дзён тыдня, пра этымалогію назваў кантынентаў і назваў нот, узгадвалі факты біяграфіі славутых людзей Беларусі, слухалі ўрыўкі з іх твораў.

Арганізатары заўсёды імкнуліся разнастаіць заданні, таму прапаноўвалі ўдзельнікам як традыцыйныя для лінгвістычных алімпіяд фармулёўкі заданняў (выправіць памылкі ў тэксце; утварыць ад назоўнікаў прыметнікі; адрозніць мнагазначныя словы ад амонімаў; запісаць тэрмін па яго азначэнні; запісаць словы ў транскрыпцыі і палічыць у іх колькасць гукаў і г.д.), так і менш пашыраныя: рашыць фанетычную або граматычную прапорцыю, запоўніць пропускі ў табліцы.

Заданні ўскладняюцца ад выпрабавання да выпрабавання, многія з іх скіраваны на выяўленне ў студэнтаў умення аналізаваць моўны матэрыял і рабіць высновы на аснове гэтага аналізу. Напрыклад, удзельнікам было прапанавана запоўніць трэці слупок у табліцы – назваць вядомыя камп'ю-

тарныя тэрміны, абапіраючыся на інфармацыю пра значэнне гэтых тэрмінаў у анг-лійскай мове і назвы гэтых прадметаў у іншых славянскіх мовах.

| **значэнне слова ў англійскай мове** | **тэрмін, які ўжываецца ў іншых славянскіх мовах** | **тэрмін, які ўжываецца ў беларускай мове** |
|---|---|---|
| запісная кніжка, сшытак, нататнік | у польскай мове *notatnik* у славацкай мове *prenosnik* | *ноўтбук* |
| становішча ці размяшчэнне горада, будынка і г.д. у іх асяроддзі | у польскай мове *witryna* у чэшскай мове *stránky* | *сайт* |
| папка, у якой дакументы, лісты размешчаны ў зручным парадку для захоўвання | у польскай мове *dokument* у чэшскай мове *obrázek* | *файл* |

З цягам часу мяняўся і рэгламент алімпіяды: першапачаткова ўдзельнікі выбывалі пасля кожнага выпрабавання, у апошнія гады ўсе маюць магчымасць прайсці тры выпрабаванні, і толькі потым пачынаецца адсеў пасля кожнага задання, сёмае (фінальнае) заданне, як правіла, выконваюць 7 удзельнікаў, прычым фіналістам можа стаць і той, хто выбыў на першым этапе і паспеў набраць найбольшую колькасць балаў, выконваючы спецыяльныя заданні для балельшчыкаў. У алімпіядзе прымаюць удзел студэнты ўсіх курсаў і шанс перамагчы ёсць у кожнага, паколькі важны не столькі аб'ём ведаў, колькі адчуванне мовы, уменне рабіць вывады на аснове аналізу прапанаваных моўных фактаў, кемлівасць. Зместавая насычанасць, нетрадыцыйная форма, дэмакратычны рэгламент забяспечылі алімпіядзе папулярнасць.

Такім чынам, алімпіяда па беларускай мове з'яўляецца эфектыўным сродкам набыцця лінгвістычных ведаў, фарміравання адпаведных уменняў і навыкаў, назапашвання вопыту прафесійнай дзейнасці. Акрамя таго, алімпіяда «Septem artes līberales» стымулюе асобаснае і інтэлектуальнае развіццё студэнтаў, дазваляе павысіць цікавасць да вучэбнай дысцыпліны, развіць лагічнае мысленне, пазнавальную і творчую актыўнасць студэнтаў, што ў выніку садзейнічае ўдасканаленню якасці падрыхтоўкі будучых настаўнікаў пачатковых класаў, фарміраванню іх прафесійных кампетэнцый.

**Спіс літаратуры**

1. Образовательный стандарт высшего образования: ОСВО 1-01 02 01-2013. – Минск : Министерство образования Республики Беларусь, 2013. – 27 с.